27

13 XI 7

ПЕРШАМУ САКРАТАРУ ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА КПБ
таварышу МАШЭРАВУ П.М.

Паважаны Пётр Міронавіч!

26 лістапада 1967 года спаўняецца 60 год вядомаму беларускаму сатырыку і байкапісцу Міхасю Аляксандравічу Скрыпку.

Міхась Скрыпка нарадзіўся ў в. Месцін, Бярэзінскага раёна, Мінскай вобласці. У 1941 годзе закончыў Мінскі педагагічны інстытут імя М.Горкага. З 1930 года па 1952 г. працаваў на асветніцкай ніве, настаўнікам беларускай і рускай моваў, загадчыкам навуковай часткі у сярэдніх школах. У час Вялікай Айчыннай вайны знаходзіўся ў партызанскім атрадзе Ізоха І. У барацьбе з нямецкімі захопнікамі быў паранены і кантужаны.

Літаратурнай працай Міхась Скрыпка пачаў займацца са школьных гадоў і яшчэ ў 1926 годзе з"яўляўся дэлегатам Бабруйскай акруговай канферэнцыі "Маладняк", якой кіраваў Міхась Лынькоў. Друкаваўся яшчэ да вайны, але актыўна ўключыўся ў літаратурную дзейнасць пасля вайны. У гэты час ў рэспубліканскіх газетах і часопісах часта пачалі друкавацца вершы, апавяданні, фельетоны, камедыі Міхася Скрыпкі. Асобныя з іх былі прэміяваны на літаратурных конкурсах.

Працуе Міхась Скрыпка ў жанры сатыры. Пісьменнік умее сатырычна узнімаць і вырашаць надзённыя пытанні жыцця. Яго байкі, эпіграмы, аднаактоўкі-камедыі вядомы шырокаму чытачу, а некаторыя з іх перакладзены на рускую, украінскую і іншыя мовы народаў СССР. За апошнія гады пісьменнікам выдадзены наступныя кнігі: "Сатыра і гумар", "Мая хата не з краю", "Пад корань", "Сцеражыцеся цемрашалаў", "Дзіва ў рэшаце", "Усяк бывае", "Сатырычны калаўрот", а ў Маскве выйшлі дзве кніжкі: "Черт помог", і "Врач-гадалка". З кожным новым зборнікам майстэрства пісьменніка павышаецца і ўдасканальваецца.

Міхась Скрыпка працуе намеснікам дырэктара Бюро прапаганды мастацкай літаратуры і амаль штодзённа выступае перад чытачамі, у якіх заваявў вялікі, заслужаны поспех.

Саюз пісьменнікаў БССР просіць разгледзець пытанне аб узнагародзе Міхася Аляксандравіча Скрыпкі ў сувязі з яго 60-годдзем.

З глыбокай павагай

Першы сакратар Праўлення
СП БССР /Максім ТАНК/